# Любімы горад песняра

## Барысаўшчына ў жыцці і творчасці Янкі Купалы

**У канцы мая – пачатку чэрвеня 1925 года Беларусь адзначала 20-годдзе літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. Святкаванне праходзіла з размахам: на самых розных узроўнях праводзіліся прысвечаныя знамянальнай у жыцці паэта падзеі ўрачыстыя сходы, тэатральна-мастацкія вечарыны, чытацкія канферэнцыі і дыспуты. Якраз тады рашэннем урада маладой беларускай рэспублікі Я. Купалу было прысвоена званне народнага паэта, пасля чаго яго імя сталі надаваць некаторым бібліятэкам і школам, а таксама – вуліцам у многіх беларускіх населеных пунктах. Сярод тых, хто прыязна паставіўся да асобы песняра і ягонага творчага юбілею, былі і барысаўчане.**

З Барысава, як, зрэшты, і з іншых гарадоў і пасёлкаў, у адрас першага народнага паэта Беларусі масава дасылаліся віншавальныя тэлеграмы ад працоўных калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў, падзячныя лісты ад студэнтаў, школьнікаў і нават асобных жыхароў рэгіёна. Адзін з такіх допісаў быў апублікаваны ў газеце «Савецкая Беларусь»: «Калектывы Барысаўскага белпедтэхнікума і Варонецкага сельскагаспадарчага тэхнікума ў складзе настаўнікаў і слухачоў, сабраўшыхся на ўрачысты сход, ахвяраваны ўшаноўванню 20-летняга юбілею літаратурнай працы беларускага баяна Янкі Купалы, шлюць песняру шчырае прывітанне і жадаюць дарагому юбіляру многіх год карыснай працы» *[1]*.

У пэўным сэнсе ўся гэтая пачэсная мітусня тлумачылася ўсеагульнай эйфарыяй вакол імя паэта, стварэнню якой спрыялі ў тым ліку і цыркуляры органаў тагачаснай улады. Прынамсі, «Абмежнік народнага камісарыята БССР» раіў «адзначыць памянёную юбілейную дату ў кожнай культурна-асветнай установе, каб як мага шырэй азнаёміць моладзь і працоўныя гушчы з вялікім беларускім песняром і яго творчасцю» *[2]*. З цягам часу паступова ўзнік нават своеасаблівы культ народнага паэта. «В школах везде рядом с портретом Ленина обязательно имеется портрет Купалы, и вообще везде – в академии, в школе, на советском съезде проводится культ Купалы», – паведамляў на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 27 чэрвеня 1929 года У. Затонскі, старшыня створанай Цэнтральнай кантрольнай камісіяй Усесаюзнай кампартыі бальшавікоў кантралюючай спецгрупы, якая на працягу мая – чэрвеня таго ж года вывучала практыку нацыянальнай работы ў БССР *[3, с. 144]*.

### «На памятку першай школе г. Барысава...»

Аднак, як бы там ні было, усё ж у большасці выпадкаў Я. Купалу ў той час у Беларусі сапраўды вельмі любілі і яго кнігамі ў літаральным сэнсе зачытваліся. Таму і адрасавалі песняру самыя шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні, – беларусы чакалі яго новых твораў. І паэт «плаціў народу, чым моц яго магла», аб чым яскрава сведчыць яго тагачасная лірыка. У тым ліку і нізка вершаў, напісаных летам 1926 года, стаўшая «шырокім выяўленнем роздуму паэта, які адсвяткаваў 20-гадовы юбілей творчасці, аб гістарычным лёсе народа і сваім дачыненні да яго, аб уласным лёсе на перавале паміж мінулым і будучым...» *[4, с. 234]*.

Значнай падзеяй у культурным жыцці Барысава сярэдзіны 1925 года стала прысваенне імя Янкі Купалы 1-й гарадской школе. У каго нарадзілася ідэя прыжыццёва ўвекавечыць імя першага беларускага народнага паэта ў назве адной з

тагачасных барысаўскіх устаноў адукацыі і як паставіўся да гэтай ініцыятывы ён сам, мы не ведаем. Але, трэба думаць, што гэтае рашэнне не было спантанным, бо ў Барысаве Купалу сапраўды любілі. Дарэчы, горад на Бярэзіне прыйшоўся даспадобы і самому паэту: Іван Дамінікавіч ахвотна прыязджаў сюды ў творчыя камандзіроўкі і проста на адпачынак, а ўпершыню ён тут пабываў у малалецтве, калі жыў з бацькамі ў недалёкай вёсцы Юзафова.

Ці ведаў Я. Купала пра «сваю» школу ў Барысаве? Без сумнення, так. Як сведчаць успаміны супрацоўніка рэдакцыі газеты «Бальшавік Барысаўшчыны» Яўгена Замерфельда, паэт неаднаразова дасылаў у 1-ю барысаўскую школу свае кнігі. Праўда, на дароўных надпісах у афіцыйнай назве школы ніводнага разу не згадаў ні сваё сапраўднае імя, ні псеўданім – надпісваў тытулы сваіх твораў сціпла і лаканічна «На памятку першай школе г. Барысава. Янка Купала» *[5, с. 94]*.

У архіўных матэрыялах жыццяпісу песняра пакуль не знойдзены пацвярджэнні асабістага наведвання ім 1-й барысаўскай школы. Затое пра «гасцяванне» ў ёй восенню 1930 года крытыка так званага вульгарна-сацыялагічнага кірунку Лукаша Бэндэ вядома дакладна. Як сведчаць усё тыя ж успаміны Я. Замерфельда, Л. Бэндэ, які негатыўна ставіўся да творчасці Я. Купалы, спецыяльна прыехаў у Барысаў, каб выступіць перад мясцовымі настаўнікамі. Тут трэба зазначыць, што горад на Бярэзіне быў добра знаёмы і Л. Бэндэ: яго там ведалі многія. Летам 1923 года ён прымаў удзел у ліквідацыі бандытызму на Барысаўшчыне і ў час адной са спецаперацый быў паранены *[6]*.

У сваёй лекцыі перад настаўнікамі горада Л. Бэндэ шмат увагі ўдзяліў асобе першага народнага паэта Беларусі. І ва ўласцівай яму манеры выказаўся ў адрас Я. Купалы, мякка кажучы, не зусім аб'ектыўна – агульнавядома, што ў сваіх літаратуразнаўчых працах крытык знеслаўляў паэта, імкнуўся дыскрэдытаваць яго, абвінаваціць у буржуазным нацыяналізме, затушоўванні і скажэнні



◀ **Янка Купала. Фота 1925 года**

сацыялістычнай рэчаіснасці і нават у варожасці да савецкай улады.

Пра тон і накіраванасць гаворкі Л. Бэндэ з настаўнікамі можна меркаваць па ягоным артыкуле «Шлях паэта», апублікаваным за некалькі месяцаў да паездкі ў Барысаў у газеце «Звязда» пад сваім прозвішчам, але са змененым імем – Н. Бэндэ. Вось усяго толькі адна красамоўная цытата з той публікацыі: «Купала не зразумеў сацыялістычнага характару нашай рэвалюцыі, не здолеў захапіцца баявым і творчым энтузіязмам працоўных, што стваралі перадумовы сацыялістычнага будаўніцтва, што разбівалі кайданы адвечнага сацыяльнага рабства, што стваралі новае, але не патрыяльхальнае «раскіданае гняздо» капіталізму, а падмурак пад сусветную камуністычную рэвалюцыю» *[7]*.

Прычым, гаварыў Л. Бэндэ настолькі пераканаўча, што дырэктар 1-й школы Саляновіч, не дачакаўшыся заканчэння лекцыі, выйшаў з залы і асабіста зняў шыльду з фасада школьнага будынка *[5, с. 94]*. Пасля таго выпадку імя Янкі Купалы знікла з назвы гэтай барысаўскай навучальнай установы.

Вестка пра здарэнне ў Барысаве, вядома ж, дайшла да Купалы. Аднак ён не рабіў ніякіх захадаў дзеля свайго апраўдання. Бо гэта быў усяго толькі адзін з эпізодаў добра спланаванага цкавання паэта: летам 1930 года яго некалькі разоў выклікаюць у Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне (ДПУ), каб дапытаць па сфабрыкаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі», прыпісаць яму кіраўніцтва гэтай міфічнай арганізацыяй; у чэрвені таго ж года на хутары Акопы былі раскулачаны яго маці і сям'я сястры Марыі Аўлачынскай, што жыла непадалёк, каля вёскі Харужанцы цяперашняга Лагойскага раёна, – родныя паэта былі прызначаны да высылкі на Поўнач і па шчаслівым збегу абставін, пасля настойлівых намаганняў Я. Купалы і яго асабістых просьбаў да тагачаснага кіраўніка БССР А. Чарвякова аб пераглядзе справы, былі зняты з цягніка з раскулачанымі, які рухаўся на Котлас, якраз у Барысаве; на працягу другой паловы 1930 года па ўсё той жа справе «Саюза вызвалення Беларусі» органы ДПУ адзін за адным пачалі арыштоўваць прадстаўнікоў інтэлігенцыі, многія з якіх былі сябрамі народнага паэта; пад нож быў пушчаны ўжо надрукаваны яго зборнік «Творы. 1918–1928», забаронены друк драмы польскага паэта Е. Жулаўскага «Эрос і Псіха» ў Купалавым перакладзе…

▼ Куток старога Барысава



## «Відаць, такая доля паэтаў...»

І ўсё ж, трэба адзначыць, што намаганні Л. Бэндэ і яго памагатых не былі марнымі – яны давялі Я. Купалу да адчаю. У хуткім часе пасля выступлення крытыка-вульгарызатара ў 1-й барысаўскай школе, 20 лістапада 1930 года, ён, каб пазбегнуць далейшых здзекаў і публічнага прыніжэння, учыніў замах на ўласнае жыццё. На шчасце, лязо сцізорыка, якім, як лічыцца, паэт нанёс удар сабе ў жывот, толькі нязначна закранула пячонку. Паводле сцвярджэння вядомага купалазнаўца, у нядаўнім мінулым вядучага навуковага супрацоўніка Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ф. Ваданосавай, «Купала зрабіў спробу самагубства, якую ў бытавых размовах называюць «харакіры». Жонка Уладзіслава Францаўна пачула стогн з другога пакоя. Прыслухалася… Купала потым, паводле ўспамінаў, не мог даравацьсабе, што ён не вытрымаў болю і застагнаў… Жонка ўбачыла гэтую страшэнную карціну… Кінулася ў суседнюю хату – там жыла сям'я Шабуняў, сястры братоў Луцкевічаў. У той час у гэтай хаце жыў іх трэці брат – Стэфан Луцкевіч, ваенны ўрач, які прымаў удзел у Першай сусветнай вайне, быў рэпрэсаваны потым… Ён аказаў Купалу першую дапамогу… Пасля выкліку «хуткай дапамогі» Купалу адвезлі ў 1-ю клініку…» *[8]*, дзе ўрачам удалося выратаваць жыццё народнага паэта.

Адважыўшыся на самагубства, Я. Купала напісаў на імя старшыні ЦВК БССР А. Чарвякова перадсмяротны ліст. Ён захаваўся і зараз знаходзіцца ў фондах Дзяржаўнага літаратурнага музея песняра. З яго вынікае, што былі і некаторыя іншыя прычыны такога яго ўчынку. У прыватнасці, паэт адмаўляе сваю прыналежнасць да «Саюза вызвалення Беларусі» і не прымае адрасаваныя яму абвінавачванні ў падтрымцы вершам «Паўстань» (змешчаным яшчэ ў 1919 годзе ў газеце «Звон») кіраўніка адроджанай Польшчы Ю. Пілсудскага, калі той у жніўні 1919-га са сваім войскам увайшоў у Мінск; парыруе выпады Дзям'яна

Беднага ў з'едлівым вершы, напісаным, між іншым, у тым жа 1919 годзе і затым растыражаваным газетамі, дзе сярод іншых былі і такія радкі: «Изменил поэт народу, / Заплясал панам в угоду… / Янки посвист соловьиный / Превратился в шип змеиный…» *[9, с. 132]*.

«Таварыш Старшыня! – піша ў сваім перадсмяротным лісце Я. Купала. – Яшчэ раз, перад смерцю заяўляю, што я ў ніякай контррэвалюцыйнай арганізацыі не быў і не збіраўся быць. Ніколі не быў контррэвалюцыянерам і да контррэвалюцыі не імкнуўся. Быў толькі паэтам, які думаў аб шчасці Беларусі. Я ўміраю за Савецкую Беларусь, а не за якую іншую.

Верш мой «Паўстань» справакавалі:

1. Лёсік (Язэп Лёсік – палітычны дзеяч, пісьменнік, мовазнавец, адзін з кіраўнікоў газеты «Звон». – *С.Г.*), надрукаваўшы яго побач з артыкулам, прысвечаным Пілсудскаму, аб чым я не ведаў, бо быў на вёсцы.

2. Шыла (Мікола Шыла – грамадскі і культурны дзеяч, журналіст. – *С.Г.*), які асвятліў Дзям'яну Беднаму гэты верш у правакацыйным сэнсе.

3. Я сам, змясціўшы яго ў зборніку, не прыдаўшы гэтаму палітычнага значэння.

Я вельмі прасіў бы рэабілітаваць мяне перад працоўнымі Сав. Беларусі. Гэта можна лёгка зрабіць. Верш, змешчаны ў зборніку, мной выпраўлены.

Прасіў бы вырваць гэты верш і кніжку (размова ідзе пра верш «Паўстань» і забаронены зборнік «Творы. 1918–1928». – *С.Г.*) выпусціць.

Яшчэ адна просьба да Вас. Заапякуйцеся маймі сем'ямі, што тут у Менску і ў Барысаве. Я ўміраю з цвёрдай верай у вечнае існаванне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Папрасіце ГПУ, каб не цягалі маей жонкі. Яна таксама, як і я, ні ў чым не павінна.

Бібліятэку сваю перадаю Бел. Дзяржаўнай Бібліятэцы.

Шчыра дзякую за ўсё тое добрае, што для мяне зрабілі.

Уміраю, прымаючы тое, што лепей смерць фізічная, чымся незаслужаная смерць палітычная.


Старшыні ЦВК СССР і БССР 53
т. А. Чарвякову

Таварыш Старшыня!

Яшчэ раз, перад смерцю, заяўляю, што я ў ніякай контррэвалюцыйнай арганізацыі не быў і не збіраўся быць. Ніколі не быў контр-контррэвалюцыянерам і да контррэвалюцыі не імкнуўся. Быў толькі паэтам, які думаў аб шчасьці Беларусі. Я ўміраю за савецкую Беларусь, а не за якую іншую.

Верш мой „Паўстань" справакавалі:

1. Лёсік, надрукаваўшы яго побач з артыкулам прысвечаным Пілсудскаму, аб чым я не ведаў, бо быў на вёсцы.

2. Шыла, які асьвятліў Дзяміяну Беднаму гэты верш у правакацыйным сэнсе.

3. Я сам, зьмясьціўшы яго ў зборніку, не прыдаўшы гэтаму палітычнага значэньня.

▲ **Першая старонка перадсмяротнага ліста Я. Купалы**

Відаць, такая доля паэтаў. Павесіўся Ясенін, застрэліўся Маякоўскі, ну, і мне туды за імі дарога.

Шкадую толькі, што не змагу болей прымаць удзел у вялікім будаўніцтве, якое разгарнула партыя і Сав. улада ў БССР…» *[10]*.

Назаўтра пасля гэтага здарэння Канстанцін Гей, сакратар ЦК КП(б)Б накіраваў у Маскву свайму «саюзнаму начальніку» – сакратару ЦК ВКП(б) П. Постышаву – службовую запіску, у якой са свайго боку ахарактарызаваў і асобу па вялікім рухунку загнанага ў вугал народнага паэта: «Считаю необходимым сообщить Вам, что вчера, 20 ноября утром покушался на самоубийство Янка Купала – народный поэт Белоруссии. Покушение было несерьезным. Купала ударил себя перочинным ножом в правый бок, жизнь его вне опасности и если не будет сепси-

са, или других осложнений, то дней через пять он будет здоров.

Янка Купала входил в руководящий центр «Союза вызволення Беларуси», как о том свидетельствуют показания Лёсика, Некрашевича и других. Янка Купала являлся идейным центром нац.-демовской контрреволюции, что нашло отражение в его творчестве. Наряду с произведениями вполне советскими у него имеются стихотворения и кулацкого, и прямо контрреволюционного содержания.

Приглашенный для переговоров в ГПУ, Янка Купала упорно отрицал свою принадлежность к какой бы то ни было контрреволюционной организации и не обнаружил ни малейшего желания пойти навстречу нам в смысле хотя бы осуждения контрреволюционной деятельности своих друзей – участников и руководителей СВБ…

Все это происшествие рассматривается нами как протест против нашей политики борьбы с национал-демократизмом. Мы решили не требовать от Я. Купалы признания участия в Союзе вызволения Белоруссии и сосредоточить свои силы на требовании выступить с открытым осуждением контрреволюционной деятельности группы белорусских интеллигентов, арестованных по делу СВБ. Думаю, что нам это удастся.

Самый факт покушения на самоубийство мы, конечно, огласке не придаем…» *[11, л. 8а адв.]*.



Янка Купала. Фота 1935 года

## «Быў уцягнуты і прыняў самы блізкі ўдзел у контррэвалюцыйнай рабоце...»

Тым часам, нягледзечы на запэўніванні дактароў, рана ў Я. Купалы вельмі дрэнна загойвалася. Паэт знаходзіўся ў падаўленым стане, ён быў канчаткова зламаны душой. Ніяк не адрэагаваў ён і на тое, што аднойчы да яго ў палату «ўвайшоў вайсковец з падносам пачастункаў: дарагія цыгарэты, садавіна, салодкае. Ён паставіў паднос і сказаў: «Іван Дамінікавіч, з вас знялі абвінавачванне». Купала нібыта нават не павярнуўся паглядзець…» *[8]*. І такая рэакцыя была цалкам прадказальная з боку песняра, бо яна стала для яго вынікам пэўнага кампрамісу – пакаяннага «Адкрытага ліста Я. Купалы», апублікаванага ў «Звяздзе» 14 снежня 1930 года.

У ім народны паэт «прызнаваўся», што «прасякнуты нацыянал-дэмакратычнай заразай, прышчэпленай мне нашаніўскім перыядам маёй літаратурнай працы, калі я стаў быў адным з ідэолагаў буржуазна-дэмакратычнага «адраджэнства» і «незалежніцтва», я і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі не адмежаваўся, як гэта належала, ад акружаючага мяне нацыянал-дэмакратычнага асяродзішча, а быў уцягнуты ім і прыняў самы блізкі ўдзел у контррэвалюцыйнай рабоце віднейшых беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія на грунце Канстытуцыі Савецкай Беларусі, карыстаючыся давер’ем, якое аказана было ім з боку Савецкай улады, прыкрываючыся хлусліва заслонай фальшывых, крывадушных дэкларацый і запэўненнем, праводзілі свае шкодніцкія нацыянал-дэмакратычныя ідэі на культурным фронце… Дзякуючы гэтаму асляпленню, з’явіліся мае такія творы з ярка нацыянал-дэмакратычнымі настроямі, як, напры-

клад, «Паўстань», «Перад будучыняй», п'еса «Тутэйшыя» і інш. Камуністычная партыя і Савецкая ўлада даравалі мне гэтыя грубыя нацыянал-дэмакратычныя памылкі ў маёй творчасці» *[12]*.

Стылістыка «Адкрытага ліста», якая больш нагадвае шматлікія дырэктыўна-цыркулярныя дакументы таго часу, сведчыць, што, хутчэй за ўсё, Я. Купала пісаў яго не сам. Па ўсім відаць, за паэта гэта зрабілі іншыя. Ёсць меркаванне, што аўтарам Купалавага ліста ў рэдакцыю газеты «Звязда» мог быць і той жа Л. Бэндэ *[13, с. 211]*.

Дарэчы, пасля спробы Я. Купалы накласці на сябе рукі, крытычныя напады на яго не спыніліся. І тут па-ранейшаму праяўляў асаблівую стараннасць Л. Бэндэ. Пясняр жа на яго паклёпы рэагаваў па-свойму. Як згадваў пісьменнік Павел Пруднікаў, вясной 1931 года ў Мінску «ў Доме асветы праходзіў нейкі форум па пытаннях літаратуры. З дакладам выступіў Л. Бэндэ. Робячы «аналіз» сучаснай беларускай літаратуры, «артадаксальны крытык» значную частку свайго так званага «даклада» ўдзяліў разгрому творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа і Цішкі Гартнага.

– Я ўжо не буду гаварыць аб творчасці Цішкі Гартнага, бо яна ўся шкодная, як і ён сам. А вы, таварыш Купала, і вы, таварыш Колас, вы – нашы спадарожнікі. Так што зарубіце сабе на носе, што, калі вы не перабудуецеся і будзеце працягваць пісаць такія творы, як «Курган», «Безназоўнае», «Бандароўна», «Мужык», «Сымон-музыка», «Новая зямля» і ім падобныя, з вамі таксама будзем гаварыць на іншай мове.

Як ні дзіўна, а знайшліся адзінкі, якія па чарзе ўзыходзілі на трыбуну і паўтаралі словы Бэндэ… Калі ж Янка Купала папрасіў слова, усе падумалі, што ён дасць бой Бэндэ і яго хеўры. А той ціхенька, не спяшаючыся, падышоў да трыбуны, дастаў з кішэні лісток паперы і ўпершыню прачытаў свой славуты верш, які потым стаў хрэстаматыйным, – «Песня будаўніцтву». Як толькі ён вымавіў першыя яго радкі – «Прыйдзе новы – а мудры – гісторык, а ён прыйдзе – ужо ён ідзе», – зала сціхла. А калі закончыў чытаць, раздаліся бурныя апладысменты. А ён гэтак жа, не спяшаючыся, накіраваўся на сваё месца. І Бэндэ сядзеў як апляваны…» *[14, с. 446–447]*.



▲ Янка Купала з калгаснікамі і паэтам М. Лыньковым (другі справа). 1934 год

Янка Купала яўна быў вышэй таго негатыву, які ў 1930-я гады існаваў вакол яго імя. Праўда, і творчасць паэта ў гэты перыяд набыла іншы характар, «Я. Купала піша шэраг амаль безжыццёвых рытарычных вершаў, у якіх услаўляе сацыялістычную яву як нешта незвычайнае ў свеце…» *[13, с. 213]*.

## «А чым я магу аддзячыць майму народу?»

Куды большую душэўную спатолю паэт знаходзіў у творчых камандзіроўках па Беларусі. І даволі часта вандроўныя шляхі-дарогі прыводзілі яго ў Барысаў.

Летам 1932 года Я. Купала прыехаў да барысаўчан з групай беларускіх пісьменнікаў для ўдзелу ў так званых творчых справаздачах. Настаўнікі горада наладзілі яму вельмі цёплы прыём. Паэт быў так расчулены гэтым, што не змог стрымаць слязу. Затым ён выступаў на пашыраным пасяджэнні Барысаўскага райкама камсамола, сустракаўся з навучэнцамі сельгастэхнікума і ўсюды адчуваў сваю патрэбнасць і шчырую прызнасць і ўдзячнасць сваіх чытачоў.

Пасля гэтага паэт бываў у горадзе на Бярэзіне неаднойчы і кожны яго візіт станавіўся знамянальнай падзеяй. Пра

прыезд Янкі Купалы на Барысаўшчыну ў 1933 годзе яскрава расказваюць успаміны тагачаснага супрацоўніка газеты «Бальшавік Барысаўшчыны» Аляксандра Стафановіча: «Аднойчы раніцай мы з ім (Я. Купалам. – *С.Г.*) паехалі ў Карсакавіцкі сельсавет, дзе яго сустрэлі калгаснікі калгаса «Чырвоны баец». Купала асабліва любіў бываць у гэтым калгасе, можа таму, што тут дружна працавалі рабочыя беларусы, яўрэі, палякі. Ён казаў: «Глядзі, які тут інтэрнацыянал». Мы хадзілі па палях, размаўлялі з калгаснікамі, потым нас

▼ **Першая публікацыя паэмы Я. Купалы «Барысаў» пад загалоўкам «Да адкрыцця помніка Леніну ў Барысаве» ў нумары газеты «Звязда» ад 11 ліпеня 1934 года**



ДА АДКРЫЦЦЯ ПОМНІКА ЛЕНІНУ У БАРЫСАВЕ

Янка КУПАЛА

запрасілі снедаць у калгасны дом. Купала з задавальненнем еў тоўчаную бульбу з кіслым малаком…» *[15, с. 234]*.

У ліпені 1934 года народны паэт зноў прыехаў у горад на Бярэзіне. На гэты раз ён завітаў сюды з пісьменнікамі І. Гурскім і В. Кавалёвым. Разам са сваімі калегамі Я. Купала правёў шэраг сустрэч на прамысловых прадпрыемствах і ў навучальных установах горада. Прынамсі, з яго ўдзелам адбылася літаратурная вечарына для партыйна-камсамольскага актыву ў клубе імя М. Горкага, сустракаўся паэт і з рабочымі запалкавай фабрыкі, якая ў той час насіла назву «Пралетарская перамога», наведаў піянерскі лагер у пасёлку Стара-Барысаў.

Сведка тых падзей пісьменнік І. Гурскі ў сваіх успамінах пакінуў такія згадкі пра знаходжанне Я. Купалы ў Барысаве: «Амаль увесь ліпень 1934 года мне давялося правесці разам з Янкам Купалам на Барысаўшчыне… 1-га ліпеня 1934 года мы прыехалі ў Барысаў, і ў той жа дзень у клубе імя Горкага быў наладжаны літаратурны вечар для партыйна-камсамольскага і прафсаюзнага актыву. Зала была біткам набіта, людзі, у большасці рабочыя, стаялі ў праходах, сядзелі на сцэне… І вось старшынствуючы дае слова Янку Купалу. Усе ўсталі, гучаць працяглыя бурныя апладысменты, паэту доўга не даюць гаварыць. Усхваляваны Янка Купала непрыкметна выцірае вочы. Зрэдку калі на літаратурных вечарах паэт чытаў больш аднаго верша, а ў гэты вечар прачытаў некалькі, з натхненнем.

– Вы сёння, Іван Дамінікавіч, чыталі, як ніколі, – гавару яму.

– А чым я магу аддзячыць майму народу? – усміхнуўся ён. – Хіба толькі напісаннем новых твораў. І я напішу, адчуваю, што абавязкова напішу, магчыма, цыкл вершаў, а можа нават паэму» *[16]*.

І песняр стрымаў сваё слова. Вынікам той паездкі на Барысаўшчыну сталі натхнёныя ёю вершы «На нашым полі», «Калгасу “Чырвоны баец”», «Я – калгасніца…», «Абвілася краіна ў кветкі…», «Выпраўляла маці сына», «Хвалююцца морскія хвалі…» і інш., а таксама небезвядомая паэма «Барысаў».

Прысвечаны гораду на Бярэзіне твор Я. Купала напісаў 4 ліпеня 1934 года. Упершыню паэма была апублікавана пад загалоўкам «Да адкрыцця помніка Леніну ў Барысаве» ў мясцовай газеце «Бальшавік Барысаўшчыны», затым яе надрукавала і «Звязда». Помнік быў пастаўлены ў горадзе каля сучаснага Парку культуры і адпачынку на сродкі, сабраныя барысаўскімі рабочымі. Ён прастаяў да сярэдзіны 1980-х гадоў, пакуль у Барысаве на цэнтральнай гарадской плошчы не ўстанавілі новы манумент правадыру сусветнага пралетарыяту.

Ацэнка Купалавай паэмы «Барысаў» сучаснымі літаратуразнаўцамі рэзка адрозніваецца ад тых, што давалі сучаснікі паэта. Напрыклад, вядомы крытык У. Гніламёдаў піша: «У ідэйна-мастацкіх адносінах паэма «Барысаў», якую Купала напісаў па тагачаснаму сацыяльнаму заказу (ці загаду), падобная на дзесяткі і сотні такіх жа абстрактна-схематычных, пазбаўленых праўды твораў, якія былі выкліканы да жыцця той гістарычнай эпохай» *[13, с. 219]*.

Аднак, як бы там ні было, паэма «Барысаў» – гэта творчая спадчына нашага нацыянальнага генія, і да яе мы павінны ставіцца найперш з пункту гледжання эпохі 1930-х гадоў і тых умоў, у якіх мусіў жыць і тварыць паэт. Тым больш што ўступ да паэмы атрымаўся ў Купалы надзвычай філасофска-лірычным. Аўтар разважае пра хуткацечнасць часу і падкрэслівае сваю любоў да роднай зямлі:

*Плыве у свет рака Бяроза.*
*Плыве сягоння, як і ўчора,*
*То паміж ніцых вербалозаў,*
*То між адвечных пушчаў-бораў.*
*Сваёй вадою поіць шчыра*
*Калгасы, фабрыкі, заводы,*
*І на плячах нясе між віраў*
*Плыты, лайбы і параходы.*
*Плыве рака Бяроза плаўна,*
*Плыве, мінае горы, долы;*
*На берагах яе спраддаўна*
*Паўсталі гарады і сёлы.*
*Паўстаў Барысаў ў сотні гонаў,*
*Стаіць над рэчкай і сніць думы:*
*Якім ён быў, якія сёння*
*Яму пяюць Бярозы шумы. [17, с. 166].*

Любіў Янка Купала бываць на Барысаўшчыне і не толькі дзеля сустрэч з прыхільнікамі яго таленту, але і каб пабачыцца з родзічамі. Сястра паэта М. Аўлачынская жыла ў 1930–1935 гадах у вёсцы Дудзінка, працавала ў саўгасе «Белпушніна», потым яе сям'я пераехала ў вёску Пчэльнік Барысаўскага раёна. Адзін са швграў народнага паэта Ю. Раманоўскі, якога лёс таксама прывёў на Барысаўшчыну, працаваў у Прыямінскай МТС. У час сваёй творчай камандзіроўкі 1936 года Янка Купала наведаў сваяка. Той выкладаў на курсах трактарыстаў і пазнаёміў паэта з маладой трактарысткай Таццянай Калячонак. Пасля гэтага знаёмства быў напісаны яшчэ адзін верш з барысаўскай творчай нізкі Янкі Купалы – «Песня трактарысткі».

Неаднойчы прыязджаючы ў Барысаў пазней (апошні раз у 1939 годзе), Янка Купала заўсёды сустракаўся з чытачамі, прыхільнікамі сваёй творчасці. І заўсёды з яго вуснаў гучалі творы, натхнёныя Барысаўшчынай, у тым ліку і ўрыўкі з паэмы «Барысаў», якую пясняр прысвяціў свайму любімаму гораду і яго жыхарам.

**Сяргей ГАЛОЎКА**

**Ілюстрацыі – з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы**

## ЛІТАРАТУРА


1. Савецкая Беларусь. – 1925. – 31 мая.
2. Савецкая Беларусь. – 1925. – 29 мая.
3. Лойка, А. «За ўсё...» / А. Лойка // Янка Купала : энцыкл. даведнік. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 234–235.
4. Так начиналась национальная трагедия // Неман. – 1992. – №9 – С.140–178.
5. Ваданосава, Ф. Янка Купала і Барысаўшчына / Ф. Ваданосава // Роднае слова. – 2002. – № 6. – С. 94–96.
6. Корбут, В. Бенде. Исполнитель и жертва / В. Корбут, В. Скалабан // Советская Белоруссия: СБ. Беларусь Сегодня. – 2004. – 13 марта.
7. Бэндэ, Н. Шлях паэты / Н. Бэндэ. // Звязда. – 1930. – 25 мая.
8. 80 гадоў таму Янка Купала зрабіў харакіры // Звязда. – 2010. – 19 лістапада.
9. Цыт. па: Сачанка, Б. Сняцца сны аб Беларусі... / Б. Сачанка.– Мінск: Маст. літ., 1990. – 332 с.
10. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (далей – ДЛМЯнК). – КП 15993.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь – Фонд. 4. – Воп. 1. – Спр. 5092.
12. Адкрыты ліст Я. Купалы // Звязда. – 1930. – 14 снежня.
13. Гніламёдаў, У. Янка Купала: жыццё і творчасць / У. Гніламёдаў. – Мінск: Бел. навука, 2012. – 250 с.
14. Пруднікаў, П. Бацька беларускай літаратуры // П. Пруднікаў / Янка Купала. «Мне сняцца сны аб Беларусі...»: успаміны, эсэ, артыкулы, дакументы. – Мінск: Маст. літ., 2012. – С. 445–447.
15. Стафановіч, А. Пад уплывам песняра зямлі беларускай // А. Стафановіч / Успаміны пра Янку Купалу. – Мінск, 1982. – С. 230–238.
16. ДЛМЯнК. – КП 1366.
17. Купала, Янка. Поўны збор твораў : у 9 т. / Янка Купала. – Т. 6. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 429 с.